УДК 630:001.4
В.У. Русак, заг. кафедры, канд. філал. навук (БДТУ, г. Мінск)

# ТЭМАТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ ТЭРМІНАЎ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ

Тэматычная класіфікацыя з'яўляецца пачатковым і вельмі важным этапам у вывучэнні сістэмнай арганізацыі тэрміналагічных адзінак. Класіфікацыя лексічнага матэрыялу па тэматычных групах – адзін з найбольш распаўсюджаных і ўніверсальных прыёмаў апісання галіновай тэрміналогіі. Размеркаванне тэрмінаў па тэматычным (дакладней, паняційна-тэматычным) прынцыпе, дае магчымасць сістэматызаваць іх па сэнсавым падабенстве, убачыць спецыфіку асобных груп і падгруп адзінак, якія ўваходзяць у агульнае термінаполе, прадэманстраваць ўзаемасувязь элементаў.

У лінгвістычнай літаратуры адзначаецца, што класіфікацыя галіновай тэрміналогіі праз вылучэнне тэматычных груп носіць кожны раз свой, непаўторны характар. Звязана гэта з тым, што лексіка-тэматычныя групы слоў у адрозненне ад лексіка-семантычных ўяўляюць сабой «аб'яднанні слоў, якія засноўваюцца не на лексіка-семантычных сувязях, а на класіфікацыі саміх прадметаў і з'яў» [1, с. 256].

У наш час лясная гаспадарка разумеецца як галіна грамадскай вытворчасці, якая ажыццяўляе вывучэнне, улік, ўзнаўленне і вырошчванне лясоў, ахову іх ад пажараў, хвароб і шкоднікаў, рэгуляванне карыстання лесам у мэтах задавальнення патрэб спажыўцоў драўнянай і іншай лясной прадукцыі пры захаванні ахоўных і біярэгулюючых функцый лесу, арганізацыі выкарыстання лесу ў рэкрэацыйных і іншых мэтах. У адпаведнасці з гэтым тэрміналогія лясной гаспадаркі ўяўляе сістэму моўных адзінак, якія ўжываюцца пры лесаўпарадкаванні, таксацыі лясоў і лесагаспадарчым праектаванні; пры ахове, абароне і ўзнаўленні лясоў; пры ажыццяўленні лесакарыстання, уключаючы высечкі галоўнага і прамежкавага карыстання, іншыя высечкі, нарыхтоўку жывіцы і другарадных лясных рэсурсаў, пабочнае карыстанне лесам, карыстанне ўчасткамі ляснога фонду ў мэтах рэкрэацыі, у навукова-даследчых і вучэбных мэтах; пры захаванні біялагічнай разнастайнасці і іншых аспектах вядзення лясной гаспадаркі.

Лесагаспадарчая тэрміналогія ўяўляе сабой гетэрагенную сістэму, у якой сувязі і адносіны ў значнай ступені вызначаюцца экстралінгвістычнымі фактарамі: спецыялісты па лясной гаспадарцы разглядаюць лес як складаную прыродную з'яву.

Лесагаспадарчую тэрміналогію, якая абслугоўвае прафесійную камунікацыю супольнасці, складаюць як міжгаліновыя, так і

вузкаспецыяльныя тэрміны і номены. Міжгаліновыя адзінкі выступаюць найменнямі паняццяў, агульных для лясной гаспадаркі, прамысловасці, эканомікі, аховы прыроды, экалогіі і інш. (напрыклад, *індэкс якасці вады*, *каляндар цвіцення меданосаў*, *ацэнка мёдапрадуктыўнасці ліпавых насаджэнняў*). Вузкаспецыяльныя тэрміны – намінатыўныя і камунікатыўныя моўныя адзінкі, рэферэнтамі якіх з’яўляюцца лесаразвядзенне, ахова, абарона, выкарыстанне і ўзнаўленне лясоў.

Спіс вузкаспецыяльных адзінак лясной гаспадаркі складаецца з наступных тэматычных макрагруп:

1) лясная батаніка (аб’ядноўвае тэрміны і номены, якія суадносяцца са знешняй будовай раслін, узаемаадносінамі органаў раслін, рознымі іх зmяненнямі ў сувязі з умовамі асяроддзя, а таксама займаецца пытаннямі класіфікацыі раслін): *анізацытнае вусцейка*, *бакакветныя суквецці*, *галінастыя валаскі*, *паветраныя карані*, *пакручастае сцябло*, *каранёвая сістэма*;

2) анатомія раслін (утрымлівае адзінкі, якія абазначаюць працэсы жыццядзейнасці раслін і заканамернасці ператварэння ў іх рэчываў): *камяністыя клеткі*, *арганэлы*, *мітахондрыі*, *строма*, *ліпідныя кроплі*;

3) дэндралогія (рэферэнтамі гэтай макрагрупы з’яўляюцца дрэвавыя расліны і іх ўзаемасувязі з асяроддзем): *эпіфіты*, *тэрафіты*, *антагенез*, *дрэвы ляснога тыпу*, *шматствольнае дрэва*, *паўхмызнякі*;

4) глебазнаўства (тэрміны гэтай групы намінуюць агульныя ўласцівасці і склад глеб); бялагічная актыўнасць глеб, *біягеннасць глебы*, *баніціроўка глебы*, *эрозія глеб*, *бурыя лясныя глебы*, *гідралітычная кіслотнасць*;

5) лесазнаўства (у склад гэтай групы ўваходзяць адзінкі, якія абазначаюць рацыянальнае выкарыстанне лясоў): *абаронныя лясы*, *ветравальна-бураломныя дрэвы*, *квартальная прасека*, *стымулятар выхаду жывіцы*;

6) лясныя культуры (макрагрупа ўтрымлівае тэрміны, якія вербалізуюць паняцці штучнага вырошчвання лесу): *лесакультурны фонд*, *лесанасенная справа*, *лясныя гадавальнікі*;

7) лясная фітапаталогія (уключае тэрміны для намінацыі хвароб раслін, прычын іх узнікнення і мер барацьбы з імі): *анемахарыя*, *ведзьміны мётлы*, *трахеамікоз*, *імунітэт раслін*, *кучаравасць лісця*;

8) лясная энтамалогія (мае ў сваім складзе тэрміны, што аб’ектывізуюць назвы насякомых, якія прыносяць шкоду лясным насаджэнням, і мер барацьбы з імі): *шкоднікі лесу*, *папераджальныя метады барацьбы са шкоднікамі*, *рэкагнасцыровачны нагляд*, *каранцін раслін*, *энтамафагі*, *энтамапатагенны мікраарганізм.*

Кожная з названых макрагруп змяшчае шырокі спектр адзінак. Яны даюць уяўленне пра лес як пра складаную прыродную сістэму, усебаковае вывучэнне якой дазваляе рацыянальна выкарыстоўваць лясныя рэсурсы, а таксама ўмела абараняць іх. Напрыклад, тэрміналагічная частка макрагрупы «Лясная батаніка» складаецца з наступных груп: «Органы раслін, іх будова і функцыі», «Размнажэнне і аднаўленне раслін», «Сістэматыка раслін», «Экалогія раслін». Тэрміналагічная частка макрагрупы «Лесазнаўства» складаецца з адзінаццаці груп: «Агульныя паняцці», «Лесаўпарадкаванне», «Таксацыя лясоў», «Лесагаспадарчае праектаванне», «Ахова лесу», «Абарона лесу», «Лесааднаўленне і лесаразвядзенне», «Высечкі лесу», «Нарыхтоўка жывіцы, другарадных лясных рэсурсаў і ажыццяўленне пабочнага карыстання лесам», «Карыстанне ўчасткамі ляснога фонду ў мэтах рэкрэацыі», «Карыстанне ўчасткамі ляснога фонду ў навукова-даследчых і вучэбных мэтах». У сваю чаргу, да прыкладу, група «Лесааднаўленне і лесаразвядзенне» змяшчае дзве падгрупы («Вырошчванне ляснога пасадачнага матэрыялу» і «Узнаўленне лясоў»), а група «Высечкі лесу» змяшчае тры падгрупы («Агульныя тэрміны», «Высечкі галоўнага карыстання», «Высечкі прамежкавага карыстання і іншыя высечкі»).

Рода-відавыя адносіны ў вывучаемай сістэме адзінак носяць абагульняльны характар і складаюць аснову стварэння тэматычнай класіфікацыі. Гіперонімы як родавыя паняцці аб'ядноўваюць гіпонімы. Гіпанімічныя адносіны аб'ектывізуюцца як у фармальных, так і ў семантычных сувязях тэрмінаў. Напрыклад, тэрмін *таксацыя лясоў* з'яўляецца родавым ў адносінах да тэрмінаў *узрост насаджэння*, *запас насаджэння*, *лесасека*, *пералік дрэў*, *паўната насаджэння*, *паўната насаджэння абсалютная* і інш. Тэрміны-гіпонімы ўтрымліваюць агульную сему 'матэрыяльная ацэнка лесу' і адрозніваюцца дыферэнцыяльнымі семамі, якія паказваюць на параметр ацэнкі (вызначэнне ўзросту, вышыні і дыяметра).

Такім чынам, сучасная тэрміналогія лясной гаспадаркі ўяўляе сабой разгалінаваную сістэму, прадстаўленую васьмю тэматычнымі макрагрупамі: лясная батаніка, анатомія раслін, дэндралогія, глебазнаўства, лесазнаўства, лясныя культуры, лясная фітапаталогія, лясная энтамалогія.

ЛІТАРАТУРА

1. Филин Ф.П. О лексико-семантических группах слов. – София, 1957.